# Наперадзе ўсіх працэсаў

**Міністр культуры Анатолій Маркевіч сустрэўся з навучэнцамі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, якія дасягнулі значных поспехаў на XVI Моладзевых Дэльфійскіх гульнях краін СНД. Былі ўзнагароджаныя 29 прадстаўнікоў таленавітай моладзі і іх выкладчыкаў.**



Ва ўрачыстай абстаноўцы ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі міністр культуры падзякаваў усім удзельнікам, арганізатарам і педагогам, якія годна прадставілі нашу краіну на міжнародным узроўні.

— За сваю пакуль нядоўгую гісторыю гэты ўнікальны творчы праект набыў прызнанне і вялікі аўтарытэт, сабраў самых перспектыўных маладых творцаў, стаў сапраўдным святам мастацтва. Для нашай таленавітай моладзі, якая з запалам удзельнічае ў названым спаборніцтве, адкрываюцца магчымасці прадставіць свае дасягненні шырокай публіцы і атрымаць ацэнкі паважанага журы. Дэльфійскія гульні садзейнічаюць творчаму станаўленню маладога пакалення, — падкрэсліў Анатолій Маркевіч.

XVI Моладзевыя Дэльфійскія гульні дзяржаў-удзельніц СНД праходзілі з 14 па 18 кастрычніка ў Таджыкістане. У склад беларускай дэлегацыі ўвайшлі 32 чалавекі. Сярод іх — дзевяць сольных удзельнікаў, адзін творчы калектыў (14 чалавек), чатыры канцэртмайстры. Гэта прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, Гомельскага дзяржаўнага мастацкага каледжа і Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

Беларусы выступілі ў дзевяці намінацыях з дзесяці і атрымалі сем медалёў, у тым ліку адзін залаты, пяць сярэбраных, адзін бронзавы, і два дыпломы.

Ганаровай граматы Міністэрства культуры ўдастоіліся супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў: **Святлана Гуткоўская**, загадчык кафедры харэаграфіі, і **Вольга Масалава**, начальнік аддзела адукацыйных праектаў і сувязей з грамадскасцю Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Таксама грамату Міністэрства культуры ўручылі **Таццяне Дробышавай**, дацэнту кафедры эстраднай музыкі, і **Аляксандру Філіпаву**, дырэктару Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДУКМ.

Пасля ўзнагароджання для гасцей цырымоніі зладзілі святочны канцэрт з удзелам пераможцаў XVI Моладзевых Дэльфійскіх гульняў краін СНД.

**Ульяна КАСЦЮНІНА**